**Займеннік** – самастойная часціна мовы, якая ўказвае на прадметы, прыметы прадметаў або колькасць, не называючы іх. Займеннікі ўяўляюць сабой невялікую па колькасці, але самую ўжывальную ў мове групу слоў. Найчасцей займеннікі выкарыстоўваюцца замест назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў: «Чакае маці, чакае сына, а **ён** не едзе з дарогі дальняй» (С.Грахоўскі); «Стаялі цёплыя сонечныя дні. **Такія** дні рэдка бываюць у канцы верасня» (Кузьма Чорны); «І хто гэта выдумаў **столькі** анкет?» (П.Панчанка). Займеннікі змяняюцца па склонах: «я, мяне, мне» і г.д., некаторыя маюць формы роду: «ён, яна, яно» і ліку: «гэты, гэтыя».

Займеннікі суадносяцца са словамі пэўнай часціны мовы і ў адпаведнасці з гэтым маюць граматычныя катэгорыі. Паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы займеннікі падзяляюцца на тры групы ў залежнасці ад таго, на асобу (прадмет), прымету ці колькасць яны ўказваюць: займеннікі, суадносныя з назоўнікамі (абагульнена-прадметныя): «я», «мы», «ты», «вы», «ён (яна, яно, яны)», «сябе», «хто», «ніхто», «нішто», «нехта», «хтосьці», «хто-небудзь», «абы-хто», «нешта», «штосьці», «што-небудзь», «абы-што»; займеннікі, суадносныя з прыметнікамі (абагульнена-якасныя): «мой», «твой», «свой», «наш», «ваш», «гэты», «той», «такі», «гэтакі», «увесь», «усякі», «кожны», «сам», «самы», «іншы», «які», «каторы», «чый», «ніякі», «нічый», «якісьці», «чыйсьці», «які-небудзь», «абы-які», «абы-чый»; займеннікі, суадносныя з лічэбнікамі (абагульнена-колькасныя): «гэтулькі», «столькі», «колькі», «некалькі».

У сказе займеннік можа выконваць сінтаксічную функцыю дзейніка: «І вось **яны**, чацвёртакласнікі, насыпаліся ў хату, як тая бульба з развязанага мяшка» (Я.Брыль); іменнай часткі выказніка: «Здарэнні бываюць **усякія**» (Змітрок Бядуля); дапаўнення: «Цудоўнаю красою здзіўляе Мінск **мяне**» (Язэп Пушча); азначэння: «Не скруціць **ніякай** чорнай скрусе маладосць крылатую **маю**» (Г.Бураўкін); акалічнасці: «Ён быццам нічога не заўважыў навокал **сябе**» (Кузьма Чорны).

У залежнасці ад семантыкі займеннікі падзяляюцца на дзевяць разрадаў: асабовыя: «я», «мы», «ты», «вы», «ён», «яна», «яно», «яны»; зваротны: «сябе»; прыналежныя: «мой», «твой», «наш», «ваш», «свой»; указальныя: «гэты», «той», «такі», «гэтакі», «столькі», «гэтулькі»; азначальныя: «кожны», «сам», «самы», «увесь», «усякі», «іншы»; пытальныя: «хто?», «што?», «які?», «чый?», «каторы?», «колькі?»; адносныя: «хто», «што», «які», «чый», «каторы», «колькі»; адмоўныя: «ніхто», «нішто», «ніякі», «нічый»; няпэўныя: «нехта», «нешта», «хтосьці», «штосьці», «некаторы», «нейкі», «нечы (нейчы)», «якісьці», «чыйсьці», «хто-небудзь», «што-небудзь», «які-небудзь», «чый-небудзь», «абы-хто», «абы-што», «абы-які», «абы-чый».

**Асабовыя займеннікі** падзяляюцца на ўласна-асабовыя: «я», «мы», «ты», «вы»; асабова-ўказальныя: «ён», «яна», «яно», «яны».

Асабовыя займеннікі ўказваюць на:

асобу моўцы (1-я асоба: «я» ‘адзіночны лік’, «мы» ‘множны лік’): «**Я** чытаў гонкім соснам просты, шчыры свой верш» (П.Броўка). Займеннік «мы»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

можа паказваць: а) на групу асоб, сярод якіх знаходзіцца і моўца: «На роднай зямельцы усе **мы** не госці, усе **мы** чыесьці, усе **мы** кагосьці» (Л.Геніюш); б) на адну асобу – так званае “аўтарскае” «мы», напрыклад, у тэкстах навуковага стылю: «як мы мяркуем»;

асобу сумоўцы (2-я асоба: «ты» ‘адзіночны лік’, «вы» ‘множны лік’). Займеннік «ты» можа паказваць: а) на канкрэтную асобу: «“**Ты** ж гэта мне што даеш?” – у абурэнні запытаў дзед Талаш» (Якуб Колас); б) на чалавека наогул і такім чынам набываць абагульнена-асабовае значэнне: «**Ты**, чалавек, сам наводзь на зямлі справядлівасць» (Г.Бураўкін). Займеннік «вы» можа ўжывацца: а) пры звароце да некалькіх асоб: «Перабраўшыся на левы, лугавы бераг Сажа, **вы** трапляеце на вельмі здабытлівыя рыбацкія мясціны» (К.Кірэенка); б) як форма ветлівага звароту да адной асобы: «Арэшкін сказаў: “А **вы** ўсё прыгажэеце, Марына Астапаўна!”» (І.Шамякін);

асобу або прадмет, пра якія гавораць (3-я асоба: «ён (яна, яно)» ‘адзіночны лік’, «яны» ‘множны лік’). Займеннік «ён», як і прыметнік, мае тры формы роду: мужчынскі («ён»), жаночы («яна»), ніякі («яно»). Займеннік 3-й асобы «ён (яна, яно, яны)» патрабуе папярэдняга кантэксту, у якім называецца асоба ці прадмет: «Ёсць людзі з мудрай галавою, з нязгаслым сэрца аганьком, з магутнай сілай і красою – мы **іх** героямі завём» (П.Броўка); «Спускаемся з сопкі. Туман застаўся на **яе** вяршыні» (С.Грахоўскі).

**Зваротны займеннік** «сябе» ўказвае на асобу (прадмет), які з’яўляецца аб’ектам уласнага дзеяння: «Патрабавальны да **сябе**, І.Мележ і ў другіх цаніў перш за ўсё талент, працавітасць, сумленнасць, прынцыповасць» (П.Панчанка); «Што ні кажы, а жыццё, ужо само па **сабе**, ёсць радасць, вялікае шчасце, бясцэнны дар» (Якуб Колас). Для зваротнага займенніка «сябе» характэрна: адсутнасць граматычных катэгорый роду і ліку; адсутнасць словаформы назоўнага склону адзіночнага ліку і ўсіх словаформаў множнага ліку.

**Прыналежныя займеннікі** ўказваюць на прыналежнасць 1-й асобе («мой», «наш»), 2-й асобе («твой», «ваш»), усім тром асобам («свой»): «Прывітанне табе, незнаёмаму, неспакойнаму падарожніку, якому здарыцца падумаць, адпачыць і на **маёй** невялічкай рацэ!» (Я.Брыль); «Дзе столькі разгону для **твае** жвавасці, для **твайго** спрыту, для **тваіх** забавак, як не на касьбе!» (Якуб Колас); «І хоць не ўсё паўторыцца на свеце, я веру ў гэты лес, я веру ў сад, дзе чысціню вясны нясуць суквецці праз кожны **свой** барвовы лістапад» (А.Пысін). Для прыналежных займеннікаў характэрна: наяўнасць, як і ў прыметніках, формаў роду, ліку і склону; дапасаванне, як і прыметнікаў, да назоўнікаў.

Для выражэння прыналежнасці 3-й асобе выкарыстоўваюцца формы роднага склону асабовых займеннікаў 3-й асобы «яго (ягоны)», «яе (ейны)», «іх (іхні)»: «Лабановіч глянуў ёй у вочы, у гэтыя акруглыя, цёмныя і такія слаўныя, выразныя вочы, на **яе** чорныя тонкія бровы…» (Якуб Колас); «**Ягоны** твар загарэў на сонцы» (Цішка Гартны).

**Указальныя займеннікі** служаць для ўказання на прадметы («гэты», «той»), прыметы прадметаў («такі», «гэтакі») ці іх колькасць («столькі»,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

«гэтулькі»). Займеннік «гэты (гэта)» паказвае на пэўны блізкі прадмет або наогул вядомы прадмет: «На **гэтай** палянцы, за паўвярсты ад дарогі, раскінулася чыясь пасада» (Якуб Колас); «І ўсё, што ён бачыў, было дзіўна сагрэта Ганнінай блізкасцю, яе стомленым дыханнем, нечым цёплым, незразумелым, што паявілася ў **гэты** вечар» (І.Мележ). Займеннік «той» паказвае на аддалены прадмет або той, які ўжо быў названы: «**Той** домік нізкі нехта любіў, з тым домікам звязаны нечы лёс» (А.Вярцінскі); «Жыццё пісьменніка ў словах, дакладней, у **тым** толькі яму аднаму ўласцівым падборы слоў, з дапамогай якіх ён размаўляе з чытачом, выяўляе і сцвярджае сябе як асобу» (Б.Сачанка). Займеннікі «такі», «гэтакі» паказваюць на якасць прадмета, якая мае выдзяляльнае або ўдакладняльнае значэнне: «У **такія** часы я хвалююся» (Я.Скрыган); «Ноч была **гэткая** ж цёмная, як і ўчора» (Якуб Колас).

Граматычныя асаблівасці ўказальных займеннікаў: дапасаванне да назоўніка, з якім звязаны, у родзе, ліку, склоне займеннікаў «гэты», «той», «такі», «гэтакі»; адсутнасць катэгорый ліку і роду ў займенніках «столькі», «гэтулькі».

**Азначальныя займеннікі** паказваюць на абагульненую якасць або ўласцівасць прадметаў. Займеннік «сам (сама, само, самі)» паказвае на асобу ці прадмет – утваральнікаў дзеяння: «Заспяваць мы **самі** будзем нашы нівы» (Янка Купала); «**Сам** адзін расце дуб на далёкім полі» (Янка Купала). Займеннік «увесь (уся, усё, усе)» мае значэнне паўнаты ахопу прадметаў пэўным дзеяннем: «Заліў **усю** вуліцу вячэрні змрок» (М.Машара). Займеннікі «ўсякі (усякая, усякае, усякія)» і «кожны (кожная, кожнае, кожныя)» ужываюцца для вылучэння асобных прадметаў з раду падобных, прычым займеннік «усякі» мае адценне абагульнення, а займеннік «кожны» – раздзяляльнасці: «**Усякая** птушка сваё гняздо бароніць» (Прыказка); «У **кожнай** літаратуры ёсць свае незагойныя, балючыя раны» (Б.Сачанка). Займеннік «самы» паказвае пэўную мяжу ў часе ці прасторы: «Ужо на **самым** світанні прыляцелі падзяўбці насення шэрыя курапаткі» (Р.Ігнаценка); «У жніўеньскую поўнач, як і тады, гэтая зорка свеціць над **самай** тваёй галавой» (І.Навуменка). Займеннік «іншы (інакшы)» паказвае на адрозненне прымет: «Над нівай вясёлыя птушкі **іншыя** песні запелі» (Янка Купала).

Граматычная асаблівасць азначальных займеннікаў: яны змяняюцца па родах, ліках, склонах.

**Пытальныя займеннікі** выражаюць пытанне пра: а) асобу або прадмет («хто?», «што?»): «А **хто** там ідзе, а **хто** там ідзе ў агромністай такой грамадзе? » (Янка Купала); «“Ты ж гэта мне **што** даеш?” – у абурэнні запытаў дзед Талаш…» (Якуб Колас); б) якасць або прыналежнасць прадмета («які?», «чый?»): «**Якое** ж яно, маё Палессе, сёння?» (Б.Сачанка); «У **чыёй** жа хаце песні не змаўкаюць?» (Янка Купала); в) месца прадмета сярод іншых прадметаў («каторы?»): «А ты ў **каторы** клас хадзіў?» (А.Чарнышэўскі); г) колькасць прадметаў («колькі?»): «**Колькі** разоў пасля таго прыходзіў я на гэты бераг?» (К.Кірэенка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Адносныя займеннікі** выражаюць сэнсавыя і граматычныя адносіны паміж часткамі ў складаназалежным сказе: «Рыбаком завуць кожнага, **хто** калі-небудзь узяў у рукі вуду» (К.Кірэенка); «На старой бярозе, **што** ад вуліцы, шчабеча шпак» (Я.Брыль); «Першай вялікай рыбаю, **якую** мне ўдалося злавіць на сваю няхітрую дзіцячую вуду, быў язь» (К.Кірэенка); «Ведае кошка, **чыё** сала з’ела» (Кандрат Крапіва); «Вось і хата, **каторую** часта ён сніў» (П.Броўка); «Па рагах можна даведацца, **колькі** аленю год» (Віталь Вольскі).

Граматычныя асаблівасці пытальных і адносных займеннікаў: адсутнасць формаў роду і ліку ў займенніках «хто», «што», «колькі»; наяўнасць формаў роду і ліку ў займенніках «які», «чый», «каторы».

**Адмоўныя займеннікі** абазначаюць адмаўленне і паказваюць: а) поўную адсутнасць прадмета як суб’екта дзеяння («ніхто», «нішто»): «**Ніхто** так дзецям не спагадае, як матка родная» (Прыказка); «**Нічога** асаблівага не было ў гэты вечар, але памяць пра яго грэла і трывожыла іх потым многія гады» (І.Мележ); б) поўнае адмаўленне якасцей прадметаў ці іх прыналежнасці іншым прадметам («ніякі», «нічый»): «Нявідны не цешыў сябе **ніякімі** ілюзіямі» (Якуб Колас); «**Нічые** галасы не парушалі начной цішыні» (П.Галавач).

Граматычныя асаблівасці адмоўных займеннікаў: адсутнасць формаў роду і ліку ў займенніках «ніхто», «нішто», наяўнасць формаў роду і ліку ў займенніках «ніякі», «нічый».

**Няпэўныя займеннікі** абазначаюць: а) няпэўных асоб і прадметы («нехта», «нешта»): «А ўсё ж – чую – **нехта** з маіх субяседнікаў нецярпліва просіць слова» (К.Кірэенка); «Было чуваць, як пад страхою зацята верашчаць, пра **нешта** спрачаюцца вераб’і» (І.Мележ); б) няпэўныя якасці, уласцівасці, прыналежнасць («нейкі», «нечы», «некаторы»): «Праз **нейкі** час дымок пахучы паплыў угору, як туман» (Якуб Колас); «Чуліся шолахі, **нечыя** ціхія крокі» (Э.Самуйлёнак); в) няпэўнае выдзяленне асоб, прадметаў і прымет сярод іншых («хтосьці», «штосьці», «якісьці», «чыйсьці»): «Ціха адчыніліся дзверы, і **хтосьці** ўвайшоў» (Кузьма Чорны); «**Штосьці** свойскае і **штось** людское ў гэтых дрэў, камення і жывёл» (А.Пысін); «Знайшоўся **якісьці** добры чалавек, нарабіў бабінай хатцы падпорак і абклаў яе прызбаю» (А.Якімовіч); «Маленькія камарыкі-таўкунчыкі кучкамі гулялі на сонцы, як бы **чыясьці** нявідная рука трэсла ў паветры маленькую сетачку» (Якуб Колас); г) выдзяленне асоб, прадметаў і прымет з раду іншых і наданне ім больш акрэсленага значэння («хто-небудзь», «што-небудзь», «які-небудзь», «чый-небудзь»): «У Маскву **каму-небудзь** сапраўды прыйдзецца паехаць» (Кандрат Крапіва); «Такому чалавеку можна верыць, можна было б і даручыць **што-небудзь** важнае, неабходнае» (А.Кулакоўскі); «Машына – гэта ж вам не **які-небудзь** аблезлы конь» (А.Пальчэўскі); «Тое, што Міканор збіраўся бурыць не **чыё-небудзь**, а сваё гумно, не давала супакаення» (І.Мележ); д) няпэўных асоб ці няпэўныя прадметы і прыметы, не выдзяляючы іх з раду іншых («абы-хто», «абы-што», «абы-які», «абы-чый»): «Быць блазнам, весяліць **абы-каго**, якая невясёлая задача!» (А.Лойка);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Хлопчык збянтэжыўся і гаварыў **абы-што**» (Змітрок Бядуля); «Раней дык я мог і ў **абы-якіх** ботах зімаваць» (Кузьма Чорны); «Мельнічыха любіла паўтарaць і па-свойму тлумачыць **абы-чые** словы» (Х.Шынклер).

Граматычныя асаблівасці няпэўных займеннікаў (парадыгмы роду, ліку і склону) такія ж, як і ў пытальных, ад якіх яны ўтвораны.

*Т.Я.Старасценка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ